**АКАЗІЯНАЛЬНЫЯ АБРАДЫ** (ад стара-лац. occasionalis выпадковы), абрады, якія ўзнаўляюцца ў побыце час ад часу, па меры неабходнасці або ўзнікнення асобных, часцей крытычных, крызісных абставін. Характарызуюцца рухомасцю, своеасаблівым характарам працякання абрадавага часу, залежным ад жыццёвых абставін, якія выклікалі правядзенне гэтых абрадаў. Абрадавым дзеяннім і вербальным тэкстам аказіянальнай абраднасці ўласцівы трываласць і ўстойлівасць (кансерватызм і архаічнасць), звязаныя з тым, што А.а. праводзяцца з нагоды сітуацый, выкліканых парушэннем звыклага жыцця чалавека і ўзнікнення вострай неабходнасці іх змянення. Магічны характар аказіянальнага абрадавага дзеяння падкрэсліваўся паўторамі тэкстаў і дзеянняў, абмежаваннем полу і ўзросту выканаўцаў, рухам па коле, крыжамі і інш. Абрадавымі сродкамі выступалі розныя матэрыяльныя рэчы, абрадавая ежа, вада, нават жывёлы і птушкі, якія выконвалі ў абрадзе сімвалічную аберагальную і ачышчальную ролю. Да А.а. адносяцца абрады і звычаі выклікання дажджу ў час засухі: сімвалічнае аранне або баранаванне высахлага вадаёма, дарогі, забіванне жабы, вужа, рака, разбурэнне мурашніка і інш. Існуе таксама нямала відаў аказіянальных звычаяў і галашэнняў. У.Сысоў вылучае галашэнні пры пажары, паводцы, голадзе, хваробах, крыўдзе, нядолі і інш. Некаторыя з А.а. і паэтычных твораў з часам трансфармаваліся ў замовы, дзіцячыя песні, гульні і інш. жанры. У дзіцячых заклічках і прыгаворах ёсць нямала падобных твораў з архаічнымі зачынамі: «Дожджык, дожджык, секані (сыпані, прыпусці, перастань)...», «Сонца, сонца, выблісні ў аконца!», «Соўнушка-ядрушка, выблісні, выгляні!». А.а. і звычаі ўзнаўляюцца пры капанні калодзежа, будаўніцтве хаты, выкананні розных талок. А.а. вучоныя пачалі вывучаць у 1980-я г.

*Літ.:* Чистов К.В. К классификации обрядов жизненного цикла // Язычество восточных славян. Л., 1990; Сысоў У.М. Беларуская пахавальная абраднасць. Мн., 1995.

*М.А. Бабчонак, А.Ю. Лозка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ